01.411.3
К12
ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ
БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ, МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ

УДК 811.161.3'373.21 (476)

КАВАЛЁВА АЛЕНА ВАЛЕР'ЕЎНА

# ПЕРАЙМЕНАВАННІ Ў СІСТЭМЕ НАЗВАЎ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ БЕЛАРУСІ (1919–1991 гг.): ЛІНГВАГІСТАРЫЧНЫ, АРЭАЛЬНЫ АСПЕКТЫ

Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці
10.02.01 – беларуская мова

Навукова-бібліяграфічны аддзел

Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава»
НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

Мінск, 2013

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ва ўстанове адукацыі “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна”

**Навуковы кіраўнік:** **Шур Васіль Васільевіч,**
доктар філалагічных навук, прафесар,
загадчык кафедры, УА “Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна”,
кафедра беларускага мовазнаўства

**Афіцыйныя апаненты:** **Станкевіч Аляксандра Аляксандраўна,**
доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры, УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”,
кафедра беларускай мовы

**Капылоў Ігар Лявонавіч,**
кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
вучоны сакратар філіяла “Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы”, ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”

*20504177*

**Апаніруючая арганізацыя:** УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”

Абарона адбудзецца “21” чэрвеня 2013 года ў 12 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.03 пры ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2; тэл. 284-27-20, e-mail: inlinasbel@tut.by).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Аўтарэферат разасланы “20” мая 2013 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат філалагічных навук дацэнт Н.В. Паляшчук

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Айканімія Беларусі змяшчае самую разнастайную інфармацыю пра гаспадарчае, культурнае жыццё насельніцтва, акумулюе этнагістарычныя веды. У працэсе свайго функцыянавання сістэма айконімаў змяняецца пад уплывам лінгвістычных і экстралінгвістычных фактараў. З'ява дэнамінацыі назваў населеных пунктаў засведчана ў кожны храналагічны адрэзак: пэўная эпоха стварае ў айканіміі новыя мадэлі і новыя тапаасновы ў залежнасці ад ступені развіцця соцыуму. У перыяд з 1919 па 1991 гады XX стагоддзя ў беларускай айканіміі адбылася значная колькасць перайменаванняў.

Працэс дэнамінацыі ў акрэслены прамежак часу ў семантычным, словаўтваральным і арэальным аспектах часткова разглядаўся ў працах беларускіх даследчыкаў Я.М. Адамовіча, Н.А. Багамольнікавай, А.Я. Баханькова, А.А. Валасенка, В.А. Жучкевіча, І.Л. Капылова, В.П. Лемцюговай, Л.М. Лыча, Г.М. Мезенка, Я.Н. Рапановіча, А.Ф. Рогалева, А.А. Станкевіч, Г.А. Цыхуна, В.В. Шура і інш., аднак грунтоўнага і сістэмнага апісання перайменаванні ў айчынным мовазнаўстве яшчэ не атрымалі. Навізна даследавання заключаецца ў тым, што разгледжаны лінгвагістарычныя асаблівасці страчаных айконімаў і новых найменняў, зроблена спроба лексіка-семантычнага аналізу тапаасноў беларускіх перайменаванняў, пададзены паслядоўны параўнальны аналіз марфалагічных тыпаў страчаных айконімаў і новых адзінак, вызначана іх пераемнасць, падрыхтавана пяць лінгвістычных карт, якія наглядна ілюструюць арэалы пашырэння новых адзінак.

Запатрабаванасць работы абумоўлена неабходнасцю тэарэтычнага аналізу працэсу перайменавання, глыбокага асэнсавання этнічна-культурнай і этнічна-моўнай самабытнасці замененых назваў паселішчаў Беларусі. У грамадстве ў апошнія гады ўзнімаюцца пытанні пра мэтазгоднасць перайменаванняў і вяртанне часткі страчаных онімаў у тапанімічную сістэму краіны, пра неабходнасць аднаўлення некаторых гісторыка-культурных каштоўнасцей у айканіміі, таму даследаванне страчаных айконімаў і новых найменняў у лексіка-семантычным, арэальным аспектах з'яўляецца актуальным і неабходным.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне выканана на кафедры беларускага мовазнаўства УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна" ў межах навукова-даследчай тэмы "Актуальныя праблемы лексікалогіі і анамастыкі (на матэрыяле народна-дыялектнай мовы, мовы фальклору і літаратурна-мастацкіх твораў)", зацверджанай саветам УА МДПУ імя І. П. Шамякіна, пратакол № 6

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

ад 23.12.2005 г., а таксама навукова-даследчай тэмы "Анамастычныя адзінкі ў мове беларускай мастацкай літаратуры як тэкстаўтваральныя і інтэртэкстуальныя кампаненты тэксту", якая ўваходзіць у заданне "Лінгвістычныя вобразныя сродкі ў мове беларускай мастацкай літаратуры ва ўмовах міжкультурнага дыялога" падпраграмы "Беларуская мова і беларуская літаратура ў кантэксце цывілізацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь: гісторыя, сучасны стан, тэндэнцыі" ("Беларуская мова і літаратура" Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў "Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава" (№ дзяржрэгістрацыі 20112524).

**Мэта і задачы даследавання.** Мэта дысертацыйнага даследавання – выяўленне лінгвагістарычных і арэальных адметнасцей айконімаў, страчаных у выніку перайменавання, а таксама новых найменняў у сістэме назваў населеных пунктаў Беларусі ў савецкі перыяд (1919–1991 гг.). Пастаўленая мэта прадугледжвае вырашэнне наступных задач:

1) вызначыць перыяды перайменаванняў; супаставіць марфалагічныя тыпы новых найменняў і страчаных айконімаў, устанавіць іх пераемнасць; акрэсліць арэал пашырэння новых айконімаў;

2) класіфікаваць утваральныя асновы айконімаў, страчаных у выніку працэсу перайменавання;

3) выявіць гісторыка-культурную напоўненасць страчаных назваў паселішчаў;

4) сістэматызаваць утваральныя асновы новых айконімаў, высветліць асаблівасці функцыянавання новых айконімаў, а таксама вызначыць стылістычна нейтральныя перайменаванні.

**Аб'ектам** даследавання з'яўляюцца страчаныя ў выніку перайменавання найменні і новыя айконімы Беларусі пазначанага перыяду. Фактычны матэрыял перайменаваных адзінак сабраны метадам суцэльнай выбаркі з наступных крыніц: "Збор законаў і пастаноў Вярхоўнага Савета БССР", архіўныя матэрыялы, "Слоўнік назваў населеных пунктаў" па шасці абласцях Рэспублікі Беларусь Я.Н. Рапановіча, нарматыўны даведнік "Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь" па шасці абласцях Рэспублікі Беларусь, энцыклапедыя "Гарады і вёскі Беларусі", гісторыка-дакументальная хроніка "Памяць" па раёнах Беларусі. Агульная колькасць даследаваных айконімаў складае 1886 адзінак, з іх адпаведна 943 найменні – страчаныя адзінкі і 943 – новыя айконімы. У тэксце дысертацыі падаюцца афіцыйна прынятыя назвы населеных пунктаў[1].

**Прадмет** даследавання – утваральныя асновы страчаных айконімаў і новых адзінак у лінгвагістарычным і арэальным аспектах з улікам

---

[1] Напіс і форма айконімаў падаюцца ў адпаведнасці з нарматыўным даведнікам "Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь" (па шасці абласцях Рэспублікі Беларусь).

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

лінгвістычных і экстралінгвістычных фактараў. Выбар аб'екта і прадмета даследавання абумоўлены неабходнасцю ўпарадкавання айканімічнай сістэмы Беларусі ў выніку працэсу перайменавання XX стагоддзя, а таксама адсутнасцю грунтоўнага даследавання змен назваў населеных пунктаў у XX стагоддзі.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

1. Першая хваля дэнамінацыі ахоплівае 30-я гады XX стагоддзя. Другая хваля замен адбываецца ў 60-я гады і прыводзіць да з'яўлення шматлікіх айконімаў ад фларыстычных апелятываў (*Вішнёвая*, *Рама́шкі*). У 40-я гады з'яўляюцца мемарыяльныя айконімы ў гонар герояў Вялікай Айчыннай вайны. У 50-я, 70–80-я гады XX стагоддзя засведчаны спад у працэсе перайменавання. Арэальны аналіз указвае на лакалізацыю перайменаваных назваў паселішчаў пераважна на ўсходзе краіны. Новыя найменні нярэдка ўяўляюць сабой спецыфічныя мадэлі, у прыватнасці, спалучэнне апелятываў з патранімічнымі і пасесіўнымі фармантамі (*Дру́жбічы*, *Партыза́наўка*) на ўзор старажытных назваў паселішчаў. У новых найменнях засведчана частковая пераемнасць марфалагічных тыпаў (у айконімах з фіналямі *-ічы*, *-ава*, *-аўка*/*-еўка*/*-оўка*, *-шчына*, у айконімах у форме pluralia tantum, у састаўных найменнях), што ўказвае на сістэмнасць айканіміі.

2. Частка замененых айконімаў – старажытныя назвы паселішчаў апелятыўнага і антрапанімічнага паходжання. У свой час іх узнікненне было абумоўлена пэўнымі фізіка-геаграфічнымі і гісторыка-культурнымі фактарамі. Яны ўтвораны ад лексем, якія абазначаюць прамыслова-гаспадарчыя рэаліі (*Гу́та*), ад арографічных (*Крыжо́вы Лог*), фларыстычных (*Дуб'ё*), гідраграфічных апелятываў (*Кале́на*), ад назваў зямельных надзелаў (*Рог*), ад назваў тыпаў пасялення (*Фальва́рак*). Страчаныя айконімы паходзяць ад антрапонімаў, што былі тыповымі ў час узнікнення паселішча (*Ваўкі́*, *Каты́*).

3. Гісторыка-культурная напоўненасць страчаных тапонімаў сведчыць пра іх індывідуальную адметнасць (*Ліхтэ́рня*) і тыповасць для традыцыйнага айканімічнага ландшафту Беларусі (*Крыні́цы*). У названы перыяд замяняюцца айконімы, што выклікаюць пэўныя негатыўныя асацыяцыі, суадносяцца з рэлігійнай тэматыкай, з былымі рэаліямі і паняццямі, з назвамі прывілеяваных класаў (*Маргі́*, *Папо́ўка*, *Пата́шня*, *Каралі́*). Такое ўспрыманне найменняў з'яўляецца ў большасці выпадкаў памылковым або з-за суаднесенасці назваў паселішчаў з рускамоўнымі апелятывамі, або з-за сучаснага значэння лексемы ў беларускай літаратурнай мове. У акрэслены перыяд гістарычныя найменні, "нейтральныя" айконімы замяняюцца назвамі ад сімвалічных апелятываў, што адлюстроўваюць тагачасныя ідэалагічныя стэрэатыпы (*Баро́к* → *Надзе́жда*).

4. Найбольшай частотнасцю сярод новых назваў паселішчаў вызначаюцца айконімы, матываваныя лексемамі з сімвалічным значэннем,

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

найменні-мемарыялы ў гонар дзяржаўных дзеячаў, герояў грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Беларуская айканімія пазначанага перыяду характарызуецца паўтаральнасцю ад'ектываў *новы* і *чырвоны*, якія набываюць сімвалічнае значэнне ў складзе назваў паселішчаў. Новыя найменні ў большасці сваёй не адлюстроўваюць усталяваных нацыянальных традыцый у айканіміі, не заўсёды ўказваюць на фізіка-геаграфічныя адметнасці мясцовасці, не ўтрымліваюць этнічна-культурнай і гістарычнай інфармацыі. Некаторыя новыя назвы паселішчаў з цягам часу замяняюцца (*Зо́рка → Зялёная Ро́шча*), што сведчыць аб працэсе дэнамінацыі ў любую эпоху. Сярод новых найменняў вылучаюцца стылістычна нейтральныя айконімы, якія з'яўляюцца адгідранімічнымі і адайканімічнымі ўтварэннямі (*Прудо́к*, *Віць*, *Мала́я Каралёўка*). Пры засваенні беларускай мовай перайменаваных айконімаў ад рускамоўных апелятываў склалася паралельнае ўжыванне дзвюх назваў для аднаго аб'екта: адна і тая ж тапааснова па-рознаму засведчана ў айканіміі краіны.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Палажэнні і вывады дысертацыйнага даследавання атрыманы аўтарам самастойна і з'яўляюцца вынікам аналізу значнага фактычнага матэрыялу.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыі абмяркоўваліся на пасяджэннях кафедры беларускага мовазнаўства УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна" і прайшлі апрабацыю на наступных канферэнцыях: VII Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія" (Віцебск, 25–27 красавіка 2006 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў" (Мазыр, 25–26 мая 2006 г.); III Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах" (Гомель, 6–7 кастрычніка 2006 г.); V Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Мова – Літаратура – Культура: (да 80-годдзя прафесара Л.М. Шакуна)" (Мінск, 16–17 лістапада 2006 г.); VIII Міжнародных навуковых чытаннях, прысвечаных Сцяпану Некрашэвічу (Гомель, 18 мая 2007 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Гістарычны лад беларускай мовы: шляхі гістарычнага развіцця і сучасныя тэндэнцыі" (Мінск, 29–30 кастрычніка 2007 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Дыялекталогія і гісторыя беларускай мовы" (Мінск, 15–16 красавіка 2008 г.); IV Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Скарына і наш час" (Гомель, 13–14 лістапада 2008 г.); II Міжнароднай навуковай канферэнцыі "Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў" (Мазыр, 22–23 красавіка 2010 г.); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі "Беларуская

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

арфаграфія: здабыткі і перспектывы", прысвечанай 90-годдзю БДУ (Мінск, 20–21 кастрычніка 2011 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Асноўныя вынікі дысертацыі адлюстраваны ў 27 публікацыях (8,1 аўт. арк.), з іх 5 артыкулаў у рэцэнзуемых перыядычных выданнях (2,4 аўт. арк.), у тым ліку ў трох замежных, 6 артыкулаў у зборніках навуковых прац (1,5 аўт. арк.), у тым ліку ў трох замежных, 14 публікацый у зборніках матэрыялаў навуковых канферэнцый (3,8 аўт. арк.), у тым ліку ў адным замежным, 2 публікацыі ў вучэбна-метадычным дапаможніку (0,4 аўт. арк.).

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з пераліку ўмоўных абазначэнняў і скарачэнняў, уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, трох глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса, які ўключае спіс выкарыстаных крыніц (173 пазіцыі), спіс публікацый саіскальніка (27 пазіцый). Дысертацыя мае пяць дадаткаў: А) "Храналогія перайменаванняў"; Б) "Карты-схемы лакалізацыі новых айконімаў"; В) Словаўтваральныя мадэлі страчаных айконімаў і новых найменняў, пераемнасць марфалагічных тыпаў"; Г) "Утваральныя асновы страчаных айконімаў і новых найменняў"; Д) "Акт аб укараненні вынікаў НДР у навучальны працэс".

Агульны аб'ём працы – 146 старонак, з якіх тэкст дысертацыі займае 106 старонак. Бібліяграфічны спіс – 17 старонак, дадаткі – 23 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

Ва **ўводзінах** абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы даследавання, адзначаецца ступень распрацаванасці пытанняў перайменаванняў беларускай айканіміі, вызначаецца тэарэтычная і практычная значнасць даследавання.

У **агульнай характарыстыцы работы** вызначаюцца мэта, задачы, аб'ект і прадмет даследавання, фармулююцца асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону, падаюцца звесткі пра асабісты ўклад саіскальніка, апрабацыю і апублікаванасць вынікаў дысертацыі, яе структуру і аб'ём.

Глава 1 "**З'ява перайменавання ў айканіміі савецкага перыяду**" складаецца з сямі раздзелаў. У раздзеле 1.1 **"Перайменаванне як гісторыка-культурная з'ява"** вызначаецца паняцце гісторыка-культурнай біяграфіі айконіма, што ўтрымлівае наступныя інфармацыйныя блокі: адрасны і структурна-словаўтваральны, этымалогію тапоніма, яго функцыянальна-стылістычныя асаблівасці, правільнае вымаўленне і напісанне. Праблема дэнамінацыі аналізуецца даследчыкамі ў трох аспектах: палітычным (ідэалагічным), які выклікае перайменаванне, эканамічным, які забяспечвае дэнамінацыю, моўным (тапанімічным). Да прычын перайменаванняў адносяцца сацыяльныя рэвалюцыі, войны, змяненне дзяржаўнай прыналежнасці

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**Асноўныя палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў наступных публікацыях**

**Артыкулы ў рэцэнзуемых перыядычных выданнях**

1. Кавалёва, А.В. Лексіка-семантычныя асаблівасці айконімаў-перайменаванняў апелятыўнага паходжання савецкага перыяду / А.В. Кавалёва // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та. – 2007. – № 2. – С. 98–102.

2. Кавалёва, А.В. Структурныя асаблівасці беларускіх састаўных айконімаў (на матэрыяле страчаных адзінак у выніку перайменаванняў XX стагоддзя) / А.В. Кавалёва // Мова і культура / Київ. нац. ун-т ; редкол.: Д.С. Бураго [та ін.]. – Київ, 2008. – Вип. 10. – С. 70–75.

3. Кавалёва, А.В. Айконімы, матываваныя геаграфічнымі тэрмінамі (на матэрыяле адзінак, страчаных у выніку перайменаванняў XX стагоддзя) / А.В. Кавалёва // Лінгвістичні студії : зб. наук. пр. / Донец. нац. ун-т ; редкол.: А. Загнітко [та ін.]. – Донецьк, 2008. – Вип. 16. – С. 313–316.

4. Кавалёва, А.В. Страчаныя айконімы, якія суадносяцца з назвамі зямельных надзелаў / А.В. Кавалёва // Мова і культура / Київ. нац. ун-т ; редкол.: Д.С. Бураго [та ін.]. – Київ, 2009. – Вип. 11. – С. 132–138.

5. Кавалёва, А.В. Страчаныя афіксальныя айконімы Беларусі (на матэрыяле перайменаванняў XX ст.) / А.В. Кавалёва // Беларуская лінгвістыка / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: А.А. Лукашанец (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2009. – Вып. 63. – С. 97–103.

**Публікацыі ў зборніках навуковых артыкулаў**

6. Кавалёва, А.В. Айконімы-мемаратывы Беларусі савецкага перыяду / А.В. Кавалёва // Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў : зб. навук. арт. / Мазыр. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В.В. Шур [і інш.]. – Мазыр, 2006. – С. 162–165.

7. Кавалёва, А.В. Кампанент *«новы»* ў беларускай айканіміі XX стагоддзя / А.В. Кавалёва // Студії з ономастики та етимології : сб. науч. ст. / НАН України, Ін-т укр. мови ; редкол.: В.П. Шульгач [та ін.]. – Київ, 2007. – С. 121–125.

8. Кавалёва, А.В. Асаблівасці беларускіх айконімаў-перайменаванняў, утвораных ад уласных імёнаў / А.В. Кавалёва // Текст. Язык. Человек : сб. науч. тр. : в 2 ч. / Мозыр. гос. пед. ун-т ; редкол.: С.Б. Кураш [и др.]. – Мозырь, 2007. – Ч. 2. – С. 39–41.

9. Кавалёва, А.В. Страчаныя адзінкі, матываваныя гідраграфічнымі тэрмінамі / А.В. Кавалёва // Студії з ономастики та етимології : сб. науч. ст. / НАН України, Ін-т укр. мови ; редкол.: В.П. Шульгач [та ін.]. – Київ, 2009. – С. 43–49.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

10. Кавалёва, А.В. Каларатывы ў беларускай айканіміі ХХ стагоддзя / А.В. Кавалёва // Материалы по русско-славянскому языкознанию : междунар. сб. науч. тр. / Воронеж. гос. ун-т ; редкол.: Г.Ф. Ковалев [и др.]. – Воронеж, 2010. – Вып. 30. – С. 202–205.

11. Кавалёва, А.В. Дэнамінацыя беларускіх айконімаў ХХ стагоддзя / А.В. Кавалёва // Язык и дискурс: семантический, прагматический и лингводидактический аспекты : сб. науч. тр. преподавателей фак. иностр. яз. / Мозыр. гос. пед. ун-т ; редкол.: Т.Н. Талецкая [и др.]. – Мозырь, 2011. – С. 49–56.

**Матэрыялы канферэнцый**

12. Кавалёва, А.В. Семантычныя асаблівасці айконімаў савецкага перыяду, утвораных ад назваў свят і памятных падзей (на матэрыяле Брэсцкай, Гомельскай, Магілёўскай абласцей) / А.В. Кавалёва // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства, літаратуразнаўства, культуралогія : матэрыялы VII Міжнар. навук. канф., Віцебск, 25–27 крас. 2006 г. / Віцеб. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Г.М. Мезенка [і інш.]. – Віцебск, 2006. – С. 316–319.

13. Кавалёва, А.В. Айконімы савецкага перыяду, утвораныя ад апелятываў-назваў прыродных аб'ектаў і з'яў / А.В. Кавалёва // Славянская ономастика в ареальном, этимологическом и хронологическом аспектах: материалы III Междунар. науч. конф., Гомель, 6–7 окт. 2006 г. / Гомел. гос. ун-т; редкол.: Р.М. Козлова [и др.]. – Гомель, 2006. – С. 78–85.

14. Кавалёва, А.В. Айконімы-саветонімы, суадносныя з апелятывамі-сімваламі таго часу / А.В. Кавалёва // Мова – Літаратура – Культура : матэрыялы V Міжнар. навук. канф. (да 80-годдзя прафесара Л.М. Шакуна), Мінск, 16–17 ліст. 2006 г. / Беларус. дзярж. ун-т, [у аўт. рэд.]. – Мінск, 2007. – С. 164–168.

15. Кавалёва, А.В. Айконімы-пажаданні і іх страчаныя папярэднікі / А.В. Кавалёва // Имя и слово: проблемы семантико-прагматического взаимодействия в славянских языках : материалы Междунар. науч. конф., 19–20 апр. 2007 г. : в 2 ч. / Брест. гос. ун-т; редкол.: В.И. Сенкевич [и др.]. – Брест, 2007. – Ч. 2. – С. 278–281.

16. Кавалёва, А.В. Страчаныя беларускія айконімы, суадносныя з апелятывамі-канфесіяналізмамі / А.В. Кавалёва // VIII Міжнародныя навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу : зб. навук. пр. : у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А.А. Станкевіч [і інш.]. – Гомель, 2007. – Ч. 2. – С. 51–54.

17. Кавалёва, А.В. Беларускія айконімы з кантынуантамі -*itj-, страчаныя ў выніку перайменаванняў ХХ стагоддзя / А.В. Кавалёва // Гістарычны лад беларускай мовы: шляхі гістарычнага развіцця і сучасныя тэндэнцыі :

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 29–30 кастр. 2007 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства ; рэдкал.: І.Л. Капылоў [і інш.]. – Мінск, 2007. – С. 263–266.

18. Кавалёва, А.В. Страчаныя беларускія айконімы з фіналлю *-аўка*, *-оўка*, *-еўка* / А.В. Кавалёва // Актуальныя праблемы мовазнаўства і лінгвадыдактыкі : матэрыялы Рэсп. навук. канф., прысвеч. 70-годдзю з дня нараджэння праф. Г.М. Малажай, Брэст, 20–21 сак. 2008 г. / Брэсц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: М.І. Новік [і інш.]. – Брэст, 2008. – С. 171–173.

19. Кавалёва, А.В. З'ява трансанімізацыі як спосаб намінацыі айконімаў / А.В. Кавалёва // Дыялекталогія і гісторыя беларускай мовы : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 15–16 крас. 2008 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: Л.П. Кунцэвіч, Н.В. Паляшчук. – Мінск, 2008. – С. 401–405.

20. Кавалёва, А.В. Айконімы на *-шчына*, страчаныя ў выніку перайменаванняў XX стагоддзя / А.В. Кавалёва // Имя – Социум – Культура : материалы II Байкал. Междунар. ономаст. конф., Улан-Удэ, 4–6 сент. 2008 г. / Бурят. гос. ун-т ; редкол.: И.А. Дамбуев [и др.]. – Улан-Удэ, 2008. – С. 150–153.

21. Кавалёва, А.В. Страчаныя айконімы як крыніца гісторыка-культурнай інфармацыі / А.В. Кавалёва // Скарына і наш час : матэрыялы IV Міжнар. навук. канф., Гомель, 13–14 лістап. 2008 г. : у 2 ч. / Гомел. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А.А. Станкевіч [і інш.]. – Гомель, 2008. – Ч. 1. – С. 251–256.

22. Кавалёва, А.В. Беларускія айконімы з пасесіўнымі фармантамі *-ін*, *-аў/-ава*, *-ова*, *-ева*, страчаныя ў выніку перайменаванняў XX стагоддзя / А.В. Кавалёва // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства і літаратуразнаўства : матэрыялы VIII Міжнар. навук. канф., Віцебск, 22–24 кастр. 2009 г. : у 2 ч. / Віцеб. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Г.М. Мезенка (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск, 2009. – Ч. 2. – С. 45–48.

23. Кавалёва, А.В. Страчаныя адантрапанімічныя айконімы на *-і/-ы*, матываваныя імёнамі-мянушкамі / А.В. Кавалёва // Беларуская анамастыка: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 20 крас. 2010 г. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ; рэдкал.: І.Л. Капылоў [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 72–76.

24. Кавалёва, А.В. Асаблівасці дэнамінацыі ў айканіміі Беларусі XX стагоддзя / А.В. Кавалёва // Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў : матэрыялы II Міжнар. навук. канф., Мазыр, 22–23 крас. 2010 г. / Мазыр. дзярж. пед. ун-т ; рэдкал.: В.В. Шур [і інш.]. – Мазыр, 2010. – С. 197–199.

25. Кавалёва, А.В. Перайменаваныя айконімы Беларусі і спосабы іх перадачы на беларускую мову / А.В. Кавалёва // Беларуская арфаграфія: здабыткі і перспектывы : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. канф., прысвеч. 90-годдзю БДУ, Мінск, 20–21 кастр. 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: М.І. Свістунова [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 122–125.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**Вучэбна-метадычныя публікацыі**

26. Кавалёва, А.В. Перайменаванні-сімвалы ў айканіміі Гомельшчыны савецкага перыяду / А.В. Кавалёва // Курсавыя працы па беларускай мове: тэматыка, бібліяграфія, метадычныя парады : вучэб.-метад. дапам. / уклад. В.В. Шур ; пад агул. рэд. В.В. Шура. – Мінск, 2010. – С. 158–160.

27. Кавалёва, А.В. Трансанімізацыя ў айканіміі Беларусі савецкага перыяду / А.В. Кавалёва // Курсавыя працы па беларускай мове: тэматыка, бібліяграфія, метадычныя парады : вучэб.-метад. дапам. / уклад. В.В. Шур; пад агул. рэд. В.В. Шура. – Мінск, 2010. – С. 161–164.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## РЭЗЮМЭ

Кавалёва Алена Валер'еўна

**Перайменаванні ў сістэме назваў населеных пунктаў Беларусі (1919–1991 гг.): лінгвагістарычны, арэальны аспекты**

**Ключавыя словы:** айконім, гістарычная назва, дэнамінацыя, рэнамінацыя, апелятыў, уласнае імя, марфалагічны тып, арэал айконімаў.

**Мэта даследавання**: выявіць лінгвагістарычныя, арэальныя асаблівасці перайменаванняў у сістэме назваў населеных пунктаў Беларусі (1919–1991 гг.).

**Метады даследавання:** апісальны (назіранне, сістэматызацыя і абагульненне фактаў), супастаўляльны. Выкарыстаны лексіка-семантычны аналіз, элементы этымалагічнага аналізу, колькасныя падлікі.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Упершыню ў беларускім мовазнаўстве разгледжаны лінгвагістарычныя асаблівасці страчаных айконімаў і новых назваў населеных пунктаў, комплексна прааналізаваны тапаасновы страчаных і новых айканімічных адзінак; праведзены сістэмны параўнальны аналіз марфалагічных тыпаў страчаных айконімаў і новых найменняў, вызначана пераемнасць марфалагічных тыпаў айконімаў; прасочаны арэалы пашырэння акрэсленых найменняў, падрыхтаваны лінгвістычныя карты, якія ўказваюць на лакалізацыю новых назваў, утвораных ад апелятываў з сімвалічным значэннем, назваў свят, геаграфічных тэрмінаў.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні атрыманых вынікаў**. Навуковыя вынікі даследавання могуць знайсці прымяненне пры стварэнні навуковых прац па айканіміі, у практыцы вяртання, аднаўлення некаторых страчаных беларускіх айконімаў, пры ўтварэнні новых айконімаў, урбанонімаў. Матэрыялы дысертацыі знойдуць прымяненне ў вучэбным працэсе вышэйшых навучальных устаноў – пры распрацоўцы і выкладанні спецкурсаў, напісанні дапаможнікаў па тапаніміцы, пры падрыхтоўцы курсавых і дыпломных прац; у краязнаўчай і турыстычнай рабоце, пры правядзенні конкурсаў, алімпіяд.

**Галіна выкарыстання:** мовазнаўства (тапаніміка, дыялекталогія, лексікаграфія), методыка выкладання беларускай мовы, краязнаўства, этналінгвістыка, гісторыя, этнаграфія, справаводства.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## РЕЗЮМЕ

Ковалева Елена Валерьевна

**Переименования в системе названий населенных пунктов Беларуси (1919–1991 гг.): лингвоисторический, ареальный аспекты**

**Ключевые слова:** ойконим, историческое название, деноминация, реноминация, апеллятив, имя собственное, морфологический тип, ареал ойконимов.

**Цель исследования:** выявить лингвоисторические, ареальные особенности переименований в системе названий населенных пунктов Беларуси (1919–1991 гг.).

**Методы исследования:** описательный (наблюдение, систематизация и обобщение фактов), сопоставительный. Использованы лексико-семантический анализ, элементы этимологического анализа, количественные подсчеты.

Впервые в белорусском языкознании рассмотрены лингвоисторические особенности утраченных ойконимов и новых названий населенных пунктов, комплексно проанализированы топоосновы утраченных и новых ойконимических единиц; проведен системный сравнительный анализ морфологических типов утраченных ойконимов и новых названий, определена преемственность морфологических типов ойконимов; прослежены ареалы распространения обозначенных наименований, подготовлены лингвистические карты, которые указывают на локализацию новых названий, образованных от апеллятивов с символическим значением, названий праздников, географических терминов.

**Рекомендации по использованию полученных результатов**. Научные результаты исследования могут найти применение при создании научных трудов по ойконимии, в практике возвращения, обновления некоторых утраченных белорусских ойконимов, при образовании новых ойконимов, урбанонимов. Материалы диссертации найдут применение в учебном процессе в высших учебных заведениях – при разработке и преподавании спецкурсов, написании пособий по топонимике, при подготовке курсовых и дипломных работ; в краеведческой и туристической работе, при проведении конкурсов, олимпиад.

**Область применения:** языкознание (топонимика, диалектология, лексикография), методика преподавания белорусского языка, краеведение, этнолингвистика, история, этнография, делопроизводство.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## SUMMARY

Alena Kavaliova

### Denomination of the Belarusian place names (1919–1991): linguohistorical, areal aspects

**Key words:** oikonym, historical name, denomination, renomination, appellative, proper name, morphological type, area of oikomyms.

**The aim of the research** is to define the linguohistorical, areal peculiarities of the denomination of the Belarusian place names (1919–1991).

**Methods of the research:** descriptive method (observation, systematization and generalization of the facts), contrastive method. Lexical and semantic analysis, elements of the component analysis, quantitative calculation are used.

**Obtained results and their novelty.** For the first time in the Belarusian linguistics the linguohistorical peculiarities of the lost oikonyms and new ones are revealed, the toponymic stems of the lost place names and new ones are analyzed; lost place names and new ones are analyzed according to their morphological types, the continuity of the oikonymic morphological types is defined; the areas of these place names are traced, the linguistic maps are prepared, they point at the localization of the new place names, which are based on the appellatives with symbolic meaning, holiday names and geographical terms.

**Recommendations on the use of the received results.** The main statements and results of the paper will be applied for scientific works on oikonymy, for the practice of renaming of some lost Belarusian place names, in creating new oikonyms und urbanonyms. The materials of the research can be used in the process of teaching in higher educational establishments – in working out and teaching special courses, in writing toponymical textbooks, course and diploma works; in local and touristic activities, linguistic competitions.

**The sphere of application:** linguistics (toponymy, dialectology, lexicography), methods of the Belarusian language teaching, study of local history, ethnolinguistics, history, ethnography, paperwork management.